View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
PolotskSU

lМинистерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет»

# ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ, СПОРТА И ТУРИЗМА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Электронный сборник материалов
Республиканского научно-практического семинара
(Новополоцк, 24 марта 2017 г.)

Новополоцк
2017

PolotskSU

Все права на размножение и распространение в любой форме остаются за УО «Полоцкий государственный университет».

Нелегальное копирование и использование данного продукта запрещены.

Проблемы и перспективы развития физической культуры, спорта и туризма в Республике Беларусь : электрон. сб. материалов Респ. науч.-практ. семинара, Новополоцк, 24 марта 2017 г. / Полоц. гос. ун-т ; отв. за вып.: Е. Н. Борун. – Новополоцк : Полоцкий государственный университет, 2017. – 1 CD-ROM.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк
Тел.: 59-37-39, 39-40-46
http://www.psu.by

Компьютерная верстка: Дарьянова Татьяна Александровна
Программное обеспечение: Мядиль Анна Николаевна
Компьютерный дизайн: Мухоморова Мария Сергеевна

№ госрегистрации 3141711728

© Борун Е. Н., 2017
© Полоцкий государственный университет, 2017

PolotskSU

**УДК 72.05: 296,735 (476.6)**

# КАТАЛІЦКІЯ ХРАМЫ ПАЎНОЧНАЙ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ ЯК ГІСТОРЫКА-АРХІТЭКТУРНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

***У.Я. Аўсейчык,*** *загадчык кафедры архітэктуры Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

***М.К. Шаўліс,*** *студэнт інжэнерна-будаўнічага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*

*На поўначы Гродзенскай вобласці Беларусі захаваліся ўнікальныя помнікі архітэктуры якія прадстаўляюць гісторыю станаўлення беларускай дзяржавы. Разглядаюцца стылістычныя асаблівасці і тэндэнцыі будаўніцтва архітэктурных аб’ектаў з іх характэрным абліччам, абумоўленым багатай культурай краю, заснаванай на ўзаемаўплыве ўсходніх і заходніх традыцыях, асаблівасцямі мясцовага клімату і ўзроўню будаўнічай тэхнікі.*

За часы існавання беларускі народ пакінуў выдатную і самабытную спадчыну. Архітэктура з’яўляецца яе састаўной часткай і займае сярод помнікаў матэрыяльнай культуры асобнае месца. Менавіта ў архітэктуры больш, чым у якой іншай сферы дзейнасці, адлюстравана гісторыя чалавецтва яго ідэалогія, сацыяльна-палітычнае жыцце і эканамічнае развіцце грамадства.

Шырока вядомая архітэктурная, у тым ліку горадабудаўнічая, спадчына Гродзеншчыны. Тут на берагах Нёмана, як ні ў адным іншым рэгіёне Беларусі, захавалася значная колькасць аб’ектаў манументальнага дойлідства. Умацаванні Гродна, Ліды, Навагрудка і Крэва разам з іншымі беларускімі, літоўскімі і ўкраінскімі замкамі ўтварылі ў часы ВКЛ цэласную абарончую сістэму агульнадзяржаўнага значэння. Вялікая была яе роля ў абароне ад нападаў рыцараў-крыжакоў. Да перамогі над Тэўтонскім ордэнам у Грунвальдскай бітве 1410 года, крэпасці і замкі Гродзеншчыны з'яўляліся апорнымі пунктамі абароны.

Многія населеныя пункты Гродзенскай вобласці захавалі ў сваіх цэнтральных частках архітэктурна-планіровачныя асаблівасці мінулых стагоддзяў, а таксама дзясяткі твораў архітэктуры. Многіх з іх, на шчасце, не закранулі горадабудаўнічыя пераўтварэнні апошніх стагоддзяў. Слонім і Навагрудак, Крэва і Гальшаны, Жыровічы і Дзятлава непаўторныя ў сваім абліччы, прывабныя гістарычна-архітэктурнымі ансамблямі, вартымі ўвагі

PolotskSU

ландшафтамі. Але ёсць гарады, якія вылучаюцца складанай, шматаблічнай прыгажосцю, якая нарадзілася з напластаванняў, пакінутых рознымі эпохамі і мастацкімі стылямі. Такая прыгажосць горада Гродна [1]. Пабудовы розных часоў суседнічаюць на яго вуліцах і плошчах, і гэта не здаецца несумяшчальным, а, наадварот, складае дзіўнае адзінства і прывабнасць.

Шмат каталіцкіх храмаў захавалася на беларускай зямлі. Большасць з іх адносяцца да ахоўваемай дзяржавай гістарычна-культурнай спадчыны [2]. Так, у апошнія дзесяцігоддзі многія касцёлы Беларусі былі адноўлены або рэканструяваны.

Беларусь мае выключна багаты прыродны і гістарычна-культурны патэнцыял, спрыяльны для турызму. Адносна мяккі клімат, у спрыяльнай прапорцыі суадносяцца з ландшафтамі: адкрытыя і залесенные прасторы, багацце рэк і азёр, адсутнічаюць шырокія горнарудныя і прамысловыя раёны. Рэспубліка мае кампактную тэрыторыю, густую сетку сельскіх і гарадскіх (асабліва малых і сярэдніх) населеных пунктаў, развітую інфраструктуру дарожных камунікацый living рознага ўзроўню. У гарадах і сельскай мясцовасці знаходзіцца 1834 помнікі археалогіі, 1597 - архітэктуры, 1131 - гісторыі, 122 - мастацтва, каля 100 цэнтраў народных промыслаў і рамёстваў, дзясяткі лакальных раёнаў традыцыйнага ткацтва і вышыўкі, ганчарства, пляцення і г.д. Акрамя прыродных запаведнікаў, заказнікаў існуюць селішчы і гарады, якія ўяўляюць сабой комплексныя запаведнікі, дзе гістарычнае асяроддзе суседнічае з традыцыйна-бытавым укладам жыцця.

Турызм з'яўляецца адной з найбуйнейшых галін сусветнай эканомікі, якія дынамічна развіваюцца і спрабуюць заняць належнае месца ў эканоміцы нашай дзяржавы. У цяперашні час распрацаваны шматлікія турыстычныя маршруты разнастайнай тэматыкі і напрамкаў.

На поўначы Гродзенскай вобласці захаваліся ўнікальныя помнікі архітэктуры, якія прадстаўляюць гісторыю станаўлення беларускай дзяржавы. Помнікі архітэктуры Гродзеншчыны займаюць значнае месца ў культурнай спадчыне Беларусі. Найбольш вядомыя з іх: касцёлы ў вёсках Міхалішкі, Гервяты, Дайлідкі, Кемелішкі, Гудагай; у вёсцы Варняны - старадаўні архітэктурны ансамбль 18 стагоддзя: Юр’еўскі касцёл, дом ксяндза, аптэкара, жылая вясковая архітэктура. У Ашмянскім раёне вылучаецца вёска Баруны, дзе захаваўся адметны касцёл; а ў мястэчку Гальшаны захаваліся касцёл, царква і руіны замка роду Сапегаў [3]. На тэрыторыі Смаргонскага раёна ў вёсцы Крэва размешчаны руіны аднаго з самых старажытных сярэднявечных замкаў, у далёкія часы ў гэтым замку праходзілі важнейшыя дзяржаўныя падзеі, а зараз Крэўскі замак – гэта адзін з най-

PolotskSU

важнейшых архітэктурных помнікаў Беларусі. А ў Залессі Смаргонскага раёна знаходзіцца знакаміты палац Агінскага.

Храмы поўначы Гродзеншчыны прадстаўляюць вялікую цікавасць для турыстаў, іх багатае ўнутранае і знешняе ўбранне, разнастайнасць формаў, і, на дадзены момант, добры стан, служаць стымулам для іх выкарыстання ў турыстычнай сферы. Культурна-гістарычная спадчына і касцелы Гродзенскай вобласці прыцягваюць мноства турыстаў.

Менавіта культавыя пабудовы з'яўляюцца матэрыяльным сведчаннем багатай гісторыі краю. Касцёлы, манастыры і сёння ўпрыгожваюць гістарычныя цэнтры гарадоў і сельскіх паселішчаў Гродзеншчыны. Фарміраванне адметнай архітэктуры адбывалася на працягу доўгага часу, але калі казаць пра паўночныя ўзоры Гродзенскай вобласці, то варта згадаць прымяненне тыпаў манастырскай забудовы і арганізацыі прасторы касцёла, якія ўжо склаліся на Захадзе. Тым не менш, на тэрыторыі Беларусі ўзнікалі храмы і манастыры з іх характэрным абліччам, абумоўленым багатай культурай краю, заснаванай на ўзаемаўплыве ўсходніх і заходніх традыцый, асаблівасцямі мясцовага клімату і ўзроўню будаўнічай тэхнікі.

Нязначная адлегласць паўночнага рэгіёна Гродзеншчыны ад Вільні (усяго каля 30 км) рабіла гэтыя абшары наваколлем сталіцы, і ў краязнаўчай літаратуры яны заўсёды разглядаліся як Віленшчына.

Рэгіянальная і гістарычная залежнасць ад Вільні адбілася на спецыфіцы архітэктурнай спадчыны края. У канцы XIV ст. гэты рэгіён, разам з Вільняй, прыняў хрышчэнне па каталіцкім абрадзе (1387 г.), таму пераважная большасць ацалелых тут помнікаў сакральнай хрысціянскай архітэктуры мае каталіцкае паходжанне. Вялікія зямельныя надзелы і многія населеныя пункты паўночнага рэгіёна са старажытнасці належалі Віленскаму біскупству. З гістарычнымі падзеямі часоў фармавання Вялікага Княства Літоўскага і пашырэннем каталіцтва звязаны першыя пісьмовыя звесткі пра найбольш старажытныя мястэчкі і паселішчы рэгіёна, пра заснаванне ў іх каталіцкіх парафій. Першыя касцёлы, відавочна, былі пабудаваны з традыцыйнага мясцовага будаўнічага матэрыялу – дрэва, але, з прычыны яго недаўгавечнасці, неаднаразова перабудоўваліся, мянялі сваё аблічча і да нашага часу не дайшлі. Больш трывалыя мураваныя храмы з'яўляюцца толькі ў XVII ст. Іх архітэктура выразна адлюстроўвала ўплыў стылю барока, што панаваў у той час у храмабудаўніцтве Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, але ў беларускім дойлідстве набыў свае самабытныя рысы з прычыны моцных мясцовых будаўнічых традыцый.

Сярэдзіна XVII ст. была адзначана шматгадовай вайной паміж Рэччу Паспалітай, з аднаго боку, і Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй – з другога.

PolotskSU

Арэнай гэтай вайны стала тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага. Былі разрабаваныя і спаленыя многія населеныя пункты, якія мелі пераважна драўляную забудову, а таксама нешматлікія мураваныя збудаванні, асабліва каталіцкія храмы. Да прыкладу вёска Міхалішкі Астравецкага раёна, размешчаная на важнай воднай артэрыі, мела стратэгічнае значэнне і таксама пацярпела падчас гэтай вайны. Верагодна, у гэты час быў зруйнаваны першы мураваны касцёл у гонар Яна Хрысціцеля [4]. Фундацыя на будаўніцтва новага касцёла была зроблена пасля замірэння Рэчы Паспалітай са Швецыяй сынам першага фундатара Янам Бжастоўскім у 1662 г. Аўтарам пабудовы лічыцца архітэктар бельгійскага паходжання Крыштоф Пенс, які заснаваў цэлую дынастыю архітэктараў і дэкаратараў у Вялікім Княстве Літоўскім.

Падчас вайны ў у 1659 г. у Кракаве выйшаў першы ў Рэчы Паспалітай мясцовы трактат па архітэктуры і будаўніцтве, які пачынаўся з прадмовы «да можных» і заклікаў іх будаваць адпаведна «свайму небу і звычаю», гэта значыць, адпаведна сваім традыцыям, клімату і ладу жыцця. Мясцовы традыцыяналізм, дэкларатыўны патрыятызм, рыцарскі дух, узмоцнены ваеннымі падзеямі, – гэта прыкметы тагачаснай ідэалогіі, якая завецца ў навуцы «сарматызмам». Гэтая з’ява генетычна паходзіць ад назвы старажытнага вольнага племені сарматаў, нашчадкамі якіх лічылі сябе прадстаўнікі мясцовай шляхты. Спалучэнне ідэалогіі сарматызму з мастацкімі сродкамі агульнаеўрапейскага стылю барока, што паступова пашыраўся ў беларускім сакральным дойлідстве на працягу XVII ст., прывяло да фармавання адметнай плыні «сармацкага» барока, першым і праграмным творам якога ў гісторыі беларускай архітэктуры стаў касцёл Міхала Арханёла ў Міхалішках Астравецкага раёна.

Наступны архітэктурна-мастацкі кірунак позняга беларускага барока, названы «віленскім барока», выступае ў гісторыі еўрапейскага мастацтва з'явай значнай і самабытнай.

Шматлікія старажытныя святыні сталіцы Вялікага Княства Літоўскага моцна пацярпелі падчас пажараў горада ў 1737 і 1747 гг. Іх адбудова патрабавала вялікіх намаганняў і сродкаў. У гэты час у Вільні супольна працавалі замежныя і мясцовыя архітэктары, дэкаратары, рамеснікі розных будаўнічых прафесій, якія аднаўлялі горад, надавалі яго святыням больш сучасны еўрапейскі выгляд. У выніку гэтай дзейнасці ў сярэдзіне XVIII ст. склаўся адметны архітэктурна-мастацкі стыль, які атрымаў у мастацтвазнаўстве назву «віленскае барока». Для храмаў віленскага барока характэрныя дзве высокія шмат’ярусныя ажурныя вежы на галоўным фасадзе, якія маюць тэлескапічную будову. Ярусы вежаў паступова змянша-

PolotskSU

юцца ўверх па памерах, што надае ім моцную стэрыяскапічную перспектыву і зрокава робіць яшчэ больш высокімі і ўзнёслымі. Праёмы вежаў мелі маляўнічы фігурны абрыс, былі скразнымі, што стварала на фоне неба прыгожы карункавы ўзор, рабіла архітэктурнае збудаванне лёгкім і нібыта нематэрыяльным. Гэтую ілюзію ўзмацнялі хвалістыя абрысы планаў і фасадаў будынкаў, вытанчаны ордэрны дэкор, пышныя алтарныя кампазіцыі, якія стваралі неакрэсленыя межы паміж прасторай і масай будаўнічага матэрыялу, чым істотна адрозніваліся ад строгасці і лапідарнасці сармацкага барока папярэдняга часу.

Новы напрамак позняга беларускага барока, званага віленскім, у хуткім часе распаўсюдзіўся па ўсёй краіне і, зразумела, не абмінуў рэгіён, найбольш блізкі да сталіцы. У стылі віленскага барока ў 1760–1761 гг. на ахвяраванні парафіянаў быў пабудаваны мураваны касцёл Узвышэння святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца, адначасова з Быстрыцай было распачата будаўніцтва мураванага касцёла ў блізкай ад яе вёсцы Варняны. Юр’еўскі касцёл у Варнянах пабудаваны ў стылі віленскага барока ў 1760–1769 г. і кансэкраваны віленскім біскупам Т. Зянковічам [5]. Асноўны мастацкі акцэнт, адпаведна яго дамінантнай ролі ў ансамблі, зроблены на галоўным двухвежавым фасадзе касцёла, які выступае за межы асноўнага аб’ёма і вызначаецца вытанчанасцю і ажурнасцю сілуэта. Асноўнай славутасцю вёскі Баруны Ашмянскага раёна з'яўляецца касцёл Святых Пятра і Паўла, які быў пабудаваны ў 1757 годзе. Гэты касцёл з'яўляецца вельмі яркім увасабленнем архітэктуры віленскага барока. Дадзены ўнікальны храм знаходзіцца ў самым цэнтры вёскі.

Акрамя мураваных культавых збудаванняў на поўначы Гродзеншчыны ацалела некалькі каштоўных помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства. Відавочна, што ўсе ацалелыя на сённяшні дзень помнікі драўлянага культавага дойлідства Астравеччыны маюць агульныя рысы ў аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі і вызначаюцца сціплым дэкаратыўным вырашэнні. Першапачаткова яны былі ўзведзены ў эпоху барока, потым былі рэканструяваны ці адноўлены на старых падмурках і набылі прыкметы новых архітэктурна-мастацкіх стыляў, але трывала захоўвалі традыцыі мясцовага цяслярства паўночнага захаду Беларусі.

У пачатку ХХ ст. Заходняя Беларусь была занятая нямецкмі войскамі а пазней, калі ўвайшла ў склад Польшчы, стала рэгіёнам, дзе працягвалі развівацца традыцыі храмавага будаўніцтва і апрабоўвацца новыя еўрапейскія стылі. Да 1929 г. культавая архітэктура ў гэтым краі перажыла і ўнутраную стылістычную эвалюцыю, і адчула на сабе агульнаеўрапейскія архітэктурна-мастацкія ўплывы.

PolotskSU

Першая сусветная вайна, акупацыя нямецкай арміяй і войскамі Польшчы не перарвалі ў Заходняй Беларуа развіццё культавай архітэктуры, што набірала ўсё больш дынамізму ў пошуках арыгінальных форм і вобразаў, якія, з аднаго боку павінны былі адпавядаць кананічным асаблівасцям адпаведнага культу, а з другой – адлюстраваць індывідуалістычную сутнасць культуры XX ст.

Істотным фактам фарміравання архітэктуры ў 20-30 гады XX ст. з'яуляюцца багатыя нацыянальныя традыцыі дойлідства. Менавіта ў гэты перыяд зараджаецца практыка рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў на строга навуковай аснове. Так, да прыкладу, быў адноўлены воблік фарнага касцёла ў Гродна (XV ст.), касцёла ў Гнезне (XV-XVI стст.), праведзена кансервацыя Лідскага, Крэўскага і Навагрудскага замкаў.

Адначасова працягваюць плённа развівацца рэгіянальныя школы народнага драўлянага дойлідства (асабліва ў Паазер’і на Палессі), працягваючы шматвяковыя мясцовыя традыцы. Гэта паўплывала і на фарміраванне нацыянал-рамантычнай плыні ў заходнебеларускіх землях, у якой у гэтыя гады намеціўся адыход ад умоўна-рэтраспектыўных прыёмаў перыяду мадэрна да стварэння вобраза храма, імкненне найбольш поўна і магутна ўвасобіць мясцовыя гістарычныя і мастацкія традыцыі. Цягам 1915-1940 гг. культавае дойлідства Заходняй Беларусі як і архітэктура наогул, перажыло некалькі этапаў стылістычнай і тэхнічнай эвалюцыі.

Першы этап, што цягнуўся ад пачатку XX ст. і лагічна, і эвалюцыйна звязаны з агульнарасійскімі тэндэнцыямі, характарызуецца імклівым ростам колькасці сакральных пабудоваў у рэтраспектыўным духу гістарызму. Гэты этап характарызуецца вялікай колькасцю аб'ектаў, пабудаваных у розных неастылях – неагатычным, неарускім, неакласіцыстычным [7]. Яскравымі прыкладамі гістарызму з'яўляюцца такія аб'екты, як касцёл Святой Троіцы ў в. Гервяты Астравецкага раёна, касцёл Узнясення Святога Крыжа ў г. Астравец, касцёл Маці Божай Добрай Рады ў в. Нястанішкі, касцёл Прасвятой Троіцы ў аг. Войстам, касцёл Маці Божай Ружанцовай у в. Солы Смаргонскага раёна, касцёл Святога Міхаіла Арханёла горада Ашмяны і інш.

Жыхары Гродзеншчыны з даўніх часоў з вялікай павагай ставіліся да Бога. Сведчанне таму – велічныя высокамастацкія храмы, шматлікія каплічкі. Яны даносяць да нас многавяковую гісторыю народа, шматпакутны лёс нацыі, яе імкненне да зямнога дабрабыту, міру, ушанавання рэлігійных, агульначалавечых ідэалаў. Храмы – гэта святыні, якія беражліва, з пакалення ў пакаленне, народ ахоўваў ад гістарычных катаклізмаў, каб перадаць у будучыню ўвасоблены ў іх неацэнны духоўны скарб, неразменную каштоўнасць – душу нацыі.

PolotskSU

ЛІТАРАТУРА


1. Харэўскі, С.В. Культавая архітэктура Заходняй Беларусі / С.В. Харэўскі // Искусство и культура. – 2012. – № 3(7). –18 с.
2. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы Беларусі / А.М. Кулагін; фатограф А.Л. Дыбоўскі. – Мінск: Беларусь. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. 488 с.: іл.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / гал. рэд. С. В. Марцэлеў. - Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1986. - 408 с. : іл.
4. Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Астравецкага раёна: Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2004. 632 с.:іл.
5. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com. – Дата доступу: 21.09.2016.
6. Беларускае дойлідства [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://library.by/portalus/modules/belarus/ . -Дата доступу: 28.09.2016 .